3. Вызначце прыметы экстэнсіўнага і інтэнсіўнага шляхоў развіцця эканомікі ў змесце наступнай інфармацыі: «Пераход прадпрыемстваў да гаспадарчага разліку і самафінансавання садзейнічаў у 1986—1989 гг. росту аб'ёму прамысловай прадукцыі ў Беларусі на 27 % і павышэнню прадукцыйнасці працы на 26 %».
4. Выкажыце меркаванне, чаму беларускі мастак Міхаіл Савіцкі назваў адну са сваіх карцін «Чарнобыльская мадонна». Які сюжэт гэтага твора?
5. Ці варта характарызаваць аварыю на Чарнобыльскай АЭС як маштабную экалагічную і тэхнагенную катастрофу, у тым ліку для Беларусі? Правядзіце дыскусію па гэтым пытанні. Выкарыстайце адпаведную метадычную параду на с. 178.



Чарнобыльская мадонна. Мастак *М. Савіцкі*. 1986—1990 гг.

## § 24—25. Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў другой палове 1940-х — 1980-я гг.

***Успомніце.*** **1.** Чаму развіццё адукацыі ў БССР у 1920—1930-я гг. характарызуецца як «культурная рэвалюцыя»?
**2.** Якія з твораў мастакоў Валянціна Волкава і Міхаіла Савіцкага вам вядомы?

***Вучэбная задача.*** Ахарактарызаваць ролю адукацыі ў станаўленні індустрыяльнага грамадства, унёсак ураджэнцаў Беларусі ў развіццё навукі, а таксама гістарычныя сюжэты ў беларускай літаратуры і мастацтве.

**Развіццё сістэмы народнай адукацыі.** У пасляваенны перыяд для аднаўлення школ патрабавалася адрамантаваць ці нанава ўзвесці будынкі, наладзіць выпуск школьнага абсталявання, вучэбнай літаратуры, падрыхтаваць настаўнікаў. Рамонтам і будаўніцтвам школ займаліся не толькі будаўнікі, але і настаўнікі, бацькі вучняў і вайскоўцы.

З дакладной запіскі пасляваеннага часу загадчыка Магілёўскага абласнога аддзела адукацыі: «Калі ў школах не было партаў, дык з дошак збівалі даўжынёй на 5—6 месцаў нешта падобнае да парты, якая ў будучым як экспанат павінна трапіць у музей. Калі ў вокнах захаваліся некалькі шыбаў, дык яны вымаліся і імі зашклялася адно акно, а астатнія забіваліся дошкамі. Калі не было класнай дошкі — рабілася рама, а на яе набіваўся ліст абгарэлай бляхі, на якой добра трымаўся след ад цвёрдага кавалка белай гліны, што замяняла крэйду».

Правообладатель Издательский центр БГУ

Толькі ў 1950/51 навучальным годзе колькасць школ у рэспубліцы дасягнула даваеннага ўзроўню. Але колькасць вучняў была меншай, чым у перадваенныя гады, што сталася вынікам вялікіх страт насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Большасць дзяцей у ваенныя гады не наведвалі школу і сталі пераросткамі. Таму ў пачатковыя школы прымалі падлеткаў да 15-гадовага ўзросту, а ў першы і другі класы — 11-гадовых. Да сярэдзіны 1950-х гг. быў у асноўным завершаны пераход да ўсеагульнага сямігадовага навучання. Навучанне пачыналася з сямігадовага ўзросту замест васьмігадовага. Была ўведзена здача экзаменаў у 4-х і 7-х класах, а ў 10-м класе — экзамен на атэстат сталасці.

Вялікім дасягненнем стала ўвядзенне з 1958 г. абавязковай 8-гадовай адукацыі. Выпускнікі 8-х класаў працягвалі вучобу для атрымання сярэдняй адукацыі ў 10-гадовай школе, якая ў першай палове 1970-х гг. стала ўсеагульнай. Былі створаны сярэднія агульнаадукацыйныя школы, працоўныя політэхнічныя школы з вытворчым навучаннем, а таксама прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, што рыхтавалі кваліфікаваных рабочых. У развіцці адукацыі галоўным лічыўся ўсеагульны ахоп моладзі вучобай і атрыманне ёю атэстата сталасці.

У першыя пасляваенныя гады паспяхова працавалі Беларускі дзяржаўны універсітэт, беларускія політэхнічны інстытут і інстытут народнай гаспадаркі, мінскія педагагічны інстытут замежных моў і медыцынскі інстытут (**1). У першай палове 1950-х гг. адкрыліся Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту ў Гомелі, Беларускі інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі ў Мінску.



Студэнты. Мастак *В. Волкаў.* 1947 г.

*Выкажыце меркаванне, чаму беларускі мастак Валянцін Волкаў выбраў для сваёй карціны такі сюжэт.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Каб падрыхтаваць спецыялістаў для новых галін прамысловасці, у БССР былі заснаваны Магілёўскі машынабудаўнічы і Мінскі радыётэхнічны інстытуты. Пачалі працаваць Брэсцкі, Мазырскі і Полацкі педагагічныя інстытуты.

З 1974 па 1985 г. рэктарам Мазырскага педагагічнага інстытута імя Н. К. Крупскай быў таленавіты педагог і вучоны, ураджэнец Рагачоўскага павета (цяпер Кармянскі раён Гомельскай вобласці) **Міхаіл Апанасавіч Дзмітрыеў** (1921—2001). Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ён скончыў Рагачоўскі настаўніцкі інстытут і пачаў працаваць настаўнікам. За мужнасць, праяўленую ў гады Вялікай Айчыннай вайны, калі ён быў у партызанах, узнагароджаны медалём «За адвагу» і ордэнам Славы. Пасля вайны ўзначаліў Кармянскую школу-інтэрнат і ператварыў яе ў сапраўдную «школу радасці» для дзяцей-сірот, якія засталіся без бацькоў. Навучэнцы школы-інтэрната давяралі яму, а ён любіў іх не менш за трох уласных дзяцей. Яго школа стала ў 1960—1970-я гг. узорнай у БССР. За сваю самаадданую настаўніцкую працу М. А. Дзмітрыеў атрымаў званні заслужанага настаўніка БССР і Героя Сацыялістычнай Працы. Да 80 гадоў ён працягваў працаваць прафесарам у Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны.


М. А. Дзмітрыеў

*Узгадайце тых настаўнікаў, якія мелі ці маюць вялікі ўплыў на ваша навучанне і развіццё.*

У 1960—1980-я гг. вялікая ўвага надавалася таксама развіццю фізічнай культуры і спорту (**2).

**Дасягненні вучоных — ураджэнцаў Беларусі.** У пасляваенныя гады значны ўнёсак у развіццё навукі зрабілі В. Ф. Купрэвіч, Я. Б. Зяльдовіч, П. В. Сухі.

**Васіль Феафілавіч Купрэвіч** (1897—1969) — ураджэнец Барысаўскага павета Мінскай губерні (цяпер Смалявіцкі раён), доктар біялагічных навук, прафесар, якога ведалі ва ўсім свеце. Ён абараніў сваю доктарскую дысертацыю ў лістападзе 1941 г. у абложаным германскімі захопнікамі блакадным Ленінградзе, што само па сабе было жыццёвым подзвігам. Асноўнымі кірункамі навуковай дзейнасці В. Ф. Купрэвіча падчас яго кіравання Акадэміяй навук з 1952 па 1969 г. сталі батаніка, глебазнаўства, фізіялогія. Навуковец займаўся філасофскай праблемай жыцця і смерці з пункту гледжання біялогіі, што ставіць яго імя ў адзін шэраг з выдатнымі мысলярамі XX ст. Прыклаў шмат намаганняў для аднаўлення даследаванняў у галіне генетыкі, якая першапачаткова прызнавалася ў СССР


В. Ф. Купрэвіч

Правообладатель Издательский центр БГУ



Я. Б. Зяльдовіч

неперспектыўнай навукай. Яму было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Адным з галоўных стваральнікаў «савецкага ядзернага шчыта» стаў ураджэнец Мінска **Якаў Барысавіч Зяльдовіч** (1914—1987). Чалавек, які не меў вышэйшай адукацыі, у 25-гадовым узросце стаў доктарам фізіка-матэматычных навук, самастойна вывучыўшы вышэйшую матэматыку. Гэта ўнікальны выпадак у гісторыі савецкай навукі. Займаўся даследаваннем гарэння пораху пры стварэнні рэактыўных снарадаў для легендарнай «кацюшы». Ён стаў адным са стваральнікаў савецкай атамнай бомбы, выпрабаванне якой было праведзена ў 1949 г. Браў актыўны ўдзел у стварэнні савецкай вадароднай бомбы. Геніяльны вучоны за свае даследаванні стаў тройчы Героем Сацыялістычнай Працы.

*Вызначце, чаму навуковыя даследаванні Я. Б. Зяльдовіча былі звязаны са стварэннем зброі.*

Важкі ўнёсак ва ўмацаванне абараназдольнасці СССР зрабіў ураджэнец Дзісенскага павета Віленскай губерні (цяпер г. Глыбокае Віцебскай вобласці), савецкі авіяканструктар, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы **Павел Восіпавіч Сухі** (1895—1975). У яго сям'і існавала папулярная калісьці традыцыя выпускаць хатні часопіс. Павел яшчэ ў дзіцячыя гады мог размяшчаць у ім свае маленькія артыкулы, вершы і малюнкі. Калі яго сям'я пераехала ў Гомель, ён скончыў з сярэбраным медалём класічную гімназію. У 15-гадовым узросце ўпершыню ўбачыў палёт самалёта і «захварэў» на авіяцыю. Юнацкая мара аказалася назаўсёды звязана з будучым прафесійным выбарам. Пасля ўдзелу ў Першай сусветнай вайне ён у 1918—1919 гг. працаваў настаўнікам матэматыкі ў школах Лунінца і Гомеля. Пасля заканчэння Маскоўскага вышэйшага тэхнічнага вучылішча пачалася яго канструктарская дзейнасць. Створаныя пад яго кіраўніцтвам франтавыя бамбардзіроўшчыкі, штурмавікі, знішчальнікі знаходзіліся на ўзбраенні Чырвонай Арміі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Шэраг унікальных самалётаў са стрэлападобнай і трохвугольнай геаметрыяй крыла пад маркай «Су» сталі асновай савецкай авіяцыі, а таксама Ваенна-паветраных сіл Рэспублікі Беларусь. У 1995 г. імя П. В. Сухога было прысвоена Гомельскаму політэхнічнаму інстытуту (цяпер — Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт). А на ўездзе ў Глыбокае ўстаноўлены помнік у выглядзе самалёта Су-17 як напамін пра тое, які чалавек тут нарадзіўся.



П. В. Сухі

*Вызначце, як узнікла і ажыццявілася юнацкая мара П. В. Сухога.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Ураджэнец Брэстчыны Пётр Клімук і ўраджэнец Меншчыны Уладзімір Кавалёнак першымі сярод беларусаў сталі лётчыкамі-касманаўтамі СССР і двойчы Героямі Савецкага Саюза. Кожны з іх здзейсніў па тры касмічныя палёты. У 1978 г. П. Клімук у час свайго трэцяга касмічнага палёту разам з польскім касманаўтам М. Германшэўскім сустрэўся на арбітальнай станцыі «Салют-6» з У. Кавалёнкам, які правёў у бязважкасці ў сукупнасці 214 сутак.

**Адлюстраванне гістарычных падзей у творах беларускай савецкай літаратуры.** Тэма Вялікай Айчыннай вайны стала адной з галоўных у беларускай літаратуры, у тым ліку ў творчасці В. Быкава. **Васіль Уладзіміравіч Быкаў** (1924—2003) — ураджэнец Ушацкага раёна Віцебскай вобласці, народны пісьменнік Беларусі, актыўны грамадскі дзеяч, Герой Сацыялістычнай Працы.



В. Быкаў каля манумента «Танк-вызваліцель», што паблізу Дома афіцэраў у Мінску. Фотаздымак 1965 г.

Пасля заканчэння школы ва ўзросце 15 гадоў паступіў вучыцца ў Віцебскае мастацкае вучылішча, але ў 1940 г. адмянілі стыпендыі, і яму давялося вярнуцца ў сваю родную вёску. У гады Вялікай Айчыннай вайны пасля заканчэння Саратаўскага пяхотнага вучылішча камандаваў артылерыйскім узводам, быў двойчы паранены. Яго родным нават прыйшла «пахаванка» — паведамленне аб тым, што ён загінуў. Калі ён даведаўся пра гэта, то сказаў: «Ну праўда, я быў біты, але не дабіты!»

В. Быкаў — аўтар сусветна вядомых, перакладзеных на многія мовы свету аповесцяў. Сярод іх — «Знак бяды», «Жураўліны крык» і інш. У аповесці «Альпійская балада» савецкі салдат Іван Цярэшка ўцякае з лагера для ваеннапалонных, які знаходзіцца ў Аўстрыі каля Альпійскіх гор. Разам з ім бяжыць італьянская дзяўчына Джулія. Паміж імі ўспыхвае каханне. Але пагоня наганяе ўцекачоў. Тады Іван штурхае дзяўчыну ў прорву з надзеяй, што яна выжыве ў снежным сумёце, а сам гіне. Пасля вайны Джулія, якая сапраўды выжыла, піша ліст да родных свайго выратавальніка і каханага. Яна паведамляе, што выхавала 18-гадовага сына і дамаглася, каб ён вывучыў рускую мову.

Паказ пісьменнікам суровай ваеннай праўды не заўсёды супадаў з афіцыйнымі меркаваннямі. У творах В. Быкава паказаны звычайны чалавек у надзвычайных умовах вайны. І для такіх людзей штодзённы гераізм стаў нормай паводзін, перадумовай перамогі над ворагам.

*Вызначце, чым было выклікана асаблівае стаўленне В. Быкава да адлюстравання ваенных падзей.*



Правообладатель Издательский центр БГУ



А. Адамовіч

Партызанскай барацьбе на акупаванай тэрыторыі Беларусі прысвечаны творы А. Адамовіча. **Аляксандр (Алесь) Міхайлавіч Адамовіч** (1927—1994) — ураджэнец Капыльшчыны, доктар філалагічных навук, пісьменнік і кінематаграфіст, грамадскі дзеяч. У 1943 г., у час Вялікай Айчыннай вайны, сям'я А. Адамовіча пакінула родную вёску і сышла ў лес. 15-гадовы Алесь стаў сувязным і байцом партызанскага атрада. Маці падправіла яму пасведчанне аб нараджэнні, каб акупанты не забралі сына ў Германію на працы. З самога сябе А. Адамовіч «спісаў» галоўнага героя свайго рамана-дылогіі «Партызаны», які складаецца з твораў «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой». Па творах пісьменніка «Хатынская аповесць» і «Карнікі» была знята мастацкая кінастужка «Ідзі і глядзі». Яна стала на Маскоўскім міжнародным кінафестывалі 1985 г. своеасаблівай «бомбай», якая выбухнула страшэннай праўдай пра мінулую вайну. Гэтую кінастужку пра падлетка, які за два дні карнай аперацыі, што праводзілі германскія акупанты, ператвараецца ў сівога старога, паглядзелі амаль 30 млн чалавек. У шматлікіх сучасных кінарэйтынгах стужка «Ідзі і глядзі» вызначана як адзін з лепшых фільмаў пра Другую сусветную вайну.

*Пазнаёмцеся з кінастужкай «Ідзі і глядзі». Якія пачуцці яна ў вас выклікала?*

Алесь Адамовіч разам з Янкам Брылём і Уладзімірам Калеснікам стварылі легендарную кнігу «Я з вогненнай вёскі». У ёй яны апублікавалі сабраныя за чатыры гады з дапамогай магнітафонных запісаў успаміны больш чым 300 жыхароў, ацалелых пасля спалення беларускіх вёсак.

А. Адамовіч адным з першых усвядоміў маштабы аварыі на Чарнобыльскай АЭС як найбуйнейшай тэхнагеннай катастрофы XX ст. Ужо 7 мая 1986 г. ён піша свайму блізкаму сябру В. Быкаву і яго жонцы: «Дарагія пацярпелыя — Васілёк, Ірына і ўвесь народ цяпер ужо двойчы хатынскі! Ці так: хатынскі і плюс хірасімскі…» Грамадзянская пазіцыя А. Адамовіча ўвасобілася ў асабістым лісце Генеральнаму сакратару ЦК КПСС М. С. Гарбачову, напісаным 1 чэрвеня 1986 г. У ім адзначалася: «…Беларусь перажывае нешта, супастаўляльнае толькі з яе трагедыяй у гады мінулай вайны. Пад пытаннем само існаванне (фізічнае) дзесяцімільённага народа. Радыяцыя ўдарыла перш за ўсё па нашай рэспубліцы».

*Вызначце, у чым заключалася грамадзянская пазіцыя А. Адамовіча.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Падзеяй у беларускай літаратуры сталі творы У. Караткевіча. **Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч** (1930—1984) — ураджэнец Оршы, пісьменнік, перакладчык, кінасцэнарыст, працаваў настаўнікам. Свае творы прысвяціў айчыннай гісторыі, раскрываў багаты духоўны свет сваіх герояў і паказваў непарыўную повязь іх асабістага лёсу з лёсам Бацькаўшчыны. У. Караткевіч планаваў напісаць трылогію, прысвечаную падзеям паўстання 1863—1864 гг., але паспеў стварыць толькі першы раман — «Каласы пад сярпом тваім», героем якога стаў Кастусь Каліноўскі.



У. Караткевіч у час падарожжа па Палессі. Фотаздымак 1980 г.

У жанры гістарычнага дэтэктыва пісьменнікам створаны аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» і раман «Чорны замак Альшанскі», якія адлюстроўваюць падзеі гістарычнага мінулага, а таксама іх сувязь з сучаснасцю.

Пачуццём любові да Радзімы і павагі да яе гісторыі напоўнены нарыс «Зямля пад белымі крыламі», дзе, у прыватнасці, адлюстроўваюцца Грунвальдская бітва, Люблінская унія, а таксама іншыя гістарычныя падзеі.

*1. Вызначце, якім па сваім характары адлюстравана ў рамане «Каласы пад сярпом тваім» паўстанне 1863—1864 гг.*
*2. Прагледзьце кінастужкі «Дзікае паляванне караля Стаха» і «Чорны замак Альшанскі». Якія пачуцці яны ў вас выклікалі?*

Беларусь у творах У. Караткевіча паўстае як цывілізаваная еўрапейская краіна са сваёй багатай гісторыка-культурнай спадчынай.

Шматлікія гістарычныя падзеі знайшлі мастацкае ўвасабленне ў творчасці І. Мележа. **Іван Паўлавіч Мележ** (1921—1976) — ураджэнец Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці, народны пісьменнік БССР, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Цэнтральнае месца ў яго творчасці займае трылогія «Палеская хроніка». Яна складаецца з раманаў «Людзі на балоце», «Подых навальніцы» і «Завеі, снежань». У гэтых творах пісьменнік расказаў пра жыццё беларускага сялянства на Палессі ў 1920—1930-я гг. у час правядзення калектывізацыі і раскулачвання. Грамадзянская смеласць І. Мележа выявілася ў праўдзівым адлюстраванні гэтых падзей. Трылогія з'яўляецца гімнам беларускаму народу і роздумам над яго гісторыяй.



І. Мележ з дачкой Ларысай. Канец 1960-х гг.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Галоўнай рысай характару І. Мележа, паводле ўспамінаў, была здольнасць суперажываць. Аднойчы, калі яго малодшая дачка Ларыса запыталася, ці хоча ён, каб у яе не было ніводнай чацвёркі (тады вучыліся па 5-бальнай сістэме), то бацька адказаў так: «Адзнакі, граматы, пахвальныя лісты — гэта не галоўнае. Важна стаць сумленным чалавекам, які не робіць непрыгожых і ганебных учынкаў».

*Вызначце сваё стаўленне да меркавання І. Мележа наконт паспяховасці навучання і маральных якасцяў чалавека.*



І. Шамякін

Плённа працаваў у галіне літаратуры І. Шамякін. **Іван Пятровіч Шамякін** (1921—2004) — ураджэнец Добрушскага раёна Гомельскай вобласці, народны пісьменнік БССР, грамадскі дзеяч, Герой Сацыялістычнай Працы. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у вызваленні Польшчы і Берлінскай наступальнай аперацыі. Працаваў настаўнікам у сельскай школе. У яго кнізе «Трывожнае шчасце», якая складаецца з пяці аповесцяў, лёс герояў звязаны з лёсам усяго пакалення. Яно прайшло праз суровыя выпрабаванні вайны, у цяжкіх пасляваенных умовах удзельнічала ў аднаўленні народнай гаспадаркі.

Раман «Глыбокая плынь» стаў першым беларускім «партызанскім» раманам. У рамане «Сэрца на далоні» правобразам доктара Савіча стаў мінскі падпольшчык доктар Яўген Клумаў. Назву раману даў аповед пра адну з аперацый Клумава яшчэ ў 1913 г., калі ён працаваў земскім доктарам на Лоеўшчыне. Тады яму давялося аперыраваць пацыента з нажавым раненнем у сэрца. Умелыя рукі Клумава выратавалі жыццё параненага, а сімвалам яго гуманнасці стала жывое ўратаванае сэрца на далоні ўрача. Праблемы Чарнобыля паказаны пісьменнікам у рамане «Злая зорка». Імя І. Шамякіна прысвоена Мазырскаму дзяржаўнаму педагагічнаму ўніверсітэту.



С. Станюта

**Гістарычны рэпертуар беларускіх тэатраў.** Значную частку рэпертуару тэатраў складалі спектаклі на ваенную тэматыку. У Купалаўскім тэатры былі пастаўлены п’есы «Заложнікі» пра Бацьку Міная і яго сям’ю, «Канстанцін Заслонаў», «Брэсцкая крэпасць». Тут працавала адна з самых знакамітых беларускіх актрыс тэатра і кіно, ураджэнка Мінска, народная артыстка БССР і СССР **Стэфанія Станюта** (1905—2000). Першую сваю тэатральную ролю яна сыграла



Правообладатель Издательский центр БГУ

ў 16 гадоў. Амаль 70 гадоў свайго жыцця служыла ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Купалы (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы), дзе сыграла каля 200 роляў. На сцэне яна магла быць і простай сялянскай жанчынай, і элегантнай лэдзі. Прыхільнікі актрысы давалі сваім дочкам рэдкае імя Стэфанія. Таленавітая актрыса была адкрытым, жыццярадасным і светлым чалавекам.

**Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў беларускім жывапісе.** Адлюстраванне партызанскай барацьбы стала адной з вызначальных тэм у творчасці М. Савіцкага. **Міхаіл Андрэевіч Савіцкі** (1922—2010) — ураджэнец Віцебшчыны, народны мастак СССР і Беларусі. У час Вялікай Айчыннай вайны ён удзельнічаў у абароне Севастопаля. Трапіў у палон і прайшоў жахі трох нацысцкіх канцлагераў, дзе цудам застаўся жывы. Свой лёс адлюстраваў у цыкле карцін «Лічбы на сэрцы», які адкрываецца аўтапартрэтам «Вязень 32815». На карціне паказаны вароты канцлагера Бухенвальд з надпісам па-нямецку: «Кожнаму сваё». На робе зняволенага можна ўбачыць дзве чырвоныя літары *K* і *L*, якія абазначаюць канцэнтрацыйны лагер. Чырвоны трохкутнік з літарай *R* на робе абазначае «рускі, палітычны». На жэтоне, падвешаным на шыі, нумар зняволенага. Страта жэтона каралася смерцю. У мастацкім цыкле М. Савіцкага «Беларусь партызанская» ў карціне «Партызанская мадонна» ўпершыню ў савецкім мастацтве створаны светлы і прывабны вобраз маці-партызанкі, поўнай надзеі, спачування і цярплівасці.



М. Савіцкі

Мастак першым у Рэспубліцы Беларусь атрымаў ордэн Францыска Скарыны. Яму першаму з айчынных дзеячаў культуры прысвоена званне «Герой Беларусі». У Мінску расчыніла свае дзверы для наведвальнікаў мастацкая галерэя М. Савіцкага.



*М. Савіцкі.* Вязень 32815. 1976 г.

*Ахарактарызуйце пачуцці зняволенага, адлюстраваныя М. Савіцкім у аўтапартрэце на карціне «Вязень 32815».*



Правообладатель Издательский центр БГУ



В. Ц. Тураў

**Гістарычная тэматыка ў беларускім кіно.** Шырокай папулярнасцю ў гледачоў карысталіся фільмы кінастудыі «Беларусьфільм». Кінарэжысёрам з яркім нацыянальным абліччам стаў ураджэнец Магілёва народны артыст БССР і СССР **Віктар Цімафеевіч Тураў** (1936—1996). У кожным з 25 яго фільмаў, у тым ліку і прысвечаных вайне, сцвярджаецца толькі прыгожае і добрае. Мастацкая кінастужка «Праз могілкі», знятая рэжысёрам у 1964 г., па рашэнні ЮНЕСКА праз 30 гадоў, у 1994 г., увайшла ў лік 100 лепшых фільмаў пра Другую сусветную вайну.

*Паглядзіце кінастужку В. Турава «Я родам з дзяцінства». Якія пачуцці яна выклікала ў вас?*

Яго карціна «Я родам з дзяцінства», створаная яшчэ ў 1966 г., была названа кінакрытыкамі ў 1995 г. лепшым фільмам за ўсю гісторыю беларускага кінематографа. У гэтай кінастужцы абпаленага танкіста, што вярнуўся з вайны, сыграў Уладзімір Высоцкі, песні якога ўпершыню прагучалі з экрана.

Гістарычныя падзеі сталі адной з тэм у творчасці беларускага кінарэжысёра М. Пташука, з імем якога звязана цэлая эпоха ў беларускім кіно. **Міхаіл Мікалаевіч Пташук** (1943—2002) — ураджэнец Брэстчыны. Народны артыст Беларусі. Нарадзіўся ў час Вялікай Айчыннай вайны ў зямлянцы, дзе маці хавалася ад акупантаў. Ім знята звыш 30 фільмаў. Нягледзячы на патрабаванне з боку самых высокіх партыйных структур, рэжысёр не выразаў з фільма «Знак бяды» паводле аповесці В. Быкава сцэну раскулачвання. З гэтым фільмам М. Пташук аб'ехаў палову свету і сабраў мноства прызоў. Ён прызнаваўся, што яму не трэба было штосьці выдумляць для сваіх фільмаў. У кожным з іх ёсць часцінка яго самога, яго маці, суседзяў, людзей, сярод якіх ён вырас.



№ 20

М. М. Пташук



У. Мулявін

**Музычная творчасць.** Папулярнасці і вядомасці беларускай песні не толькі ў СССР, але і ў свеце спрыяў вакальна-інструментальны ансамбль «Песняры» пад кіраўніцтвам У. Мулявіна. **Уладзімір Мулявін** (1943—2002) — беларускі музыкант, кампазітар, народны артыст БССР і СССР, заснавальнік і мастацкі кіраўнік «Песняроў». Назва ансамбля была ўзята з верша Янкі Купалы. Слухачы з усіх куткоў Савецкага Саюза набывалі ў кніжных крамах беларуска-рускія слоўнікі, каб зразумець, пра што спяваюць «Песняры». Сам Мулявін, ураджэнец Расіі, спецыяльна



Правообладатель Издательский центр БГУ

вывучыў беларускую мову, каб лепш разумець беларускія народныя песні.

*Паслухайце песню «Спадчына» на словы Янкі Купалы і музыку Ігара Лучанка ў выкананні ансамбля «Песняры». Якія пачуцці выклікае ў вас гэта песня?*

«Песняры» сталі першым савецкім вакальна-інструментальным ансамблем, які выступіў у Амерыцы, а амерыканская прэса назвала іх групай, якая заслужыла, каб ёй апладзіравалі стоячы. Па колькасці гастроляў у 1970-я гг. «Песнярам» не было роўных ва ўсім СССР. У. Мулявін быў узнагароджаны ордэнам Ф. Скарыны. Дагэтуль шырокай папулярнасцю карыстаюцца яго апрацоўкі народных песень, якія абуджаюць пачуццё гонару за Бацькаўшчыну.

Такім чынам, пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі, стварэнне сістэмы прафесійна-тэхнічнага навучання, адкрыццё новых устаноў вышэйшай адукацыі ў БССР садзейнічалі паспяховай падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў для індустрыяльнага грамадства. Дасягненні вучоных — ураджэнцаў Беларусі спрыялі развіццю розных галін навукі і ўмацаванню абараназдольнасці СССР. Прадстаўнікі беларускай літаратуры і мастацтва стварылі мноства твораў, якія адлюстроўвалі гераічную і трагічную мінуўшчыну беларускага народа. Дзеячаў культуры цікавіла сувязь сучаснасці з мінулым і будучым. Гісторыя разглядалася імі як аснова для выхавання павагі да чалавека, асэнсавання яго лёсу, фарміравання пачуцця патрыятызму.

****1.** Адным са студэнтаў Мінскага медыцынскага інстытута стаў **Георгій Іванавіч Сідарэнка** (1925—2014). 19-гадовым хлопцам, скончыўшы 9 класаў, ён добраахвотнікам пайшоў на фронт. Удзельнічаў у баях за вызваленне Беларусі, быў узнагароджаны медалём «За адвагу». У баі на тэрыторыі Польшчы яго цяжка параніла. Імя Г. І. Сідарэнкі было выбіта на помніку загінулым, аднак ён застаўся жывы. У шпіталі ў рэпрадуктары пачуў канцэрт для фартэпіяна з аркестрам № 1 П. І. Чайкоўскага. І Георгій падумаў, што пад такую музыку нельга паміраць. Ён запытаўся ў хірурга, ці зможа спяваць, на што ўрач адказаў, што пакуль не ведае, ці будзе ён жыць. У юнака, які стаў сведкам працы ўрачоў, што «выцягнулі яго з таго свету», з'явілася мара стаць медыкам. У 1945 г. ён паступіў у Мінскі медінстытут. А ў далейшым стаў адным з першых вучоных-медыкаў у СССР, які заснаваў кардыялагічныя брыгады, садзейнічаў развіццю медыцынскага прыборабудавання. Зрабіў значны ўнёсак у дыягностыку сардэчна-сасудзістых захворванняў на аснове мікрапрацэсарных і камп'ютарных тэхналогій.



Г. І. Сідарэнка

*Праслухайце згаданы музычны твор П. І. Чайкоўскага. Як вы лічыце, якім чынам гэты твор, а таксама лёс Г. І. Сідарэнкі паўплывалі на яго веру ў жыццё і прафесійны выбар?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

**2. Вялікі ўнёсак у развіццё савецкага спорту зрабілі беларускія спартсмены. Тройчы ўздымаўся на найвышэйшую прыступку алімпійскага п'едэстала чэмпіён XVIII, XIX, XX Алімпійскіх гульняў па вольнай барацьбе, неаднаразовы чэмпіён свету і СССР Аляксандр Мядзведзь. Ён прызнаны найлепшым спартсменам Беларусі XX ст. і найлепшым барцом вольнага стылю ў гісторыі спорту, атрымаў спецыяльную ўзнагароду ЮНЕСКА «За высакароднасць у спорце».



А. Мядзведзь



В. Корбут

«Цудам з коскамі» называлі балельшчыкі беларускую гімнастку ўраджэнку Гродна Вольгу Корбут — чатырохразовую алімпійскую чэмпіёнку, якая ў 1972 г. была прызнана лепшай спартсменкай свету. Яна першай сярод гімнастак выканала небяспечнае для жыцця сальта назад, знаходзячыся на рознавысокіх брусах. Гэты элемент атрымаў назву «пятля Корбут». Цяпер ён не выконваецца ў спартыўнай гімнастыцы.



**1.** Калі б вам прыйшлося быць вучнем школы адразу пасля вайны, якімі былі б умовы вашага навучання і ваша стаўленне да вучобы? Свой адказ растлумачце. Выкарыстайце метадычную параду «Як мадэляваць свае паводзіны ва ўмоўнай гістарычнай сітуацыі» на с. 179.

**2.** Ахарактарызуйце ўнёсак беларусаў у асваенне касмічнай прасторы.

**3.** Запоўніце ў сшытку табліцу «Творы беларускага мастацтва, прысвечаныя падзеям Вялікай Айчыннай вайны».

| Літаратура | Жывапіс | Тэатр | Кіно |
|---|---|---|---|
| | | | |

**4.** Раскажыце сюжэт аднаго з твораў літаратуры або мастацтва, з якім вы пазнаёміліся. Выкарыстайце свае веды па беларускай літаратуры.

**5.** Падрыхтуйце паведамленні пра дасягненні беларускіх спартсменаўалімпійцаў або прадстаўнікоў песеннай творчасці ў БССР у 1970—1980-я гг. і зрабіце іх прэзентацыю пры правядзенні ўрока абагульнення па раздзеле IV.



Правообладатель Издательский центр БГУ